

ПАРТЫЗАНСКІ ДРУК ЯК ЧАСТКА РАДАВОДУ 5

НАРОДНЫ КАЛЯНДАР 8-9



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

12 СТУДЗЕНЯ 2019 г. СУБОТА № 7 (28874)

## ЛІЧБА ДНЯ

**Каля 1 мільёна рублёў**

*матэрыяльнай дапамогі, абсталявання і падарункаў, паводле папярэдніх падлікаў, перадалі ў дзіцячыя ўстановы рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, дзяржарганізацыі, падпарадкаваныя ўраду, канцэрны, банкі, грамадскія аб'яднанні, уключаныя ў пералік удзельнікаў навагодняй дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці», паведамілі ў прэс -службе Міністэрства адукацыі. Рэспубліканская акцыя праходзіла з 10 снежня 2018 года да 11 студзеня 2019-га. Прадстаўнікі 91 арганізацыі наведалі 122 сацыяльна значныя аб'екты: школы-інтэрнаты, дзіцячыя дамы, дзіцячыя дамы сямейнага тыпу, дзіцячыя бальніцы, дзіцячыя сацыяльныя прытулкі, спецыяльныя вучэбна-выхаваўчыя ўстановы і інш. Усяго на рэспубліканскім узроўні ў дабрачынным мерапрыемстве прынялі ўдзел больш за 15 тысяч дзяцей.*



# ПАД КАЛЯДНЫМ БУКЛЕЕМ



**Калі пад Новы год Іван ІЛЬЮЧЫК з вёскі Багданаўка Лунінецкага раёна вяртаецца з працы (цяпер ён рамантуе фермы ў Нясвіжскім раёне), то дома абавязкова дастае свой буклей — адмысловую калядную зорку з батлеечнай інсталяцыяй. Ён гаварыцца, што яго аднавяскоўцы захавалі адзіны ў Беларусі абрад калядавання з буклеем. Яны па-ранейшаму ходзяць да сваякоў, суседзяў і сяброў, круцяць пад вокнамі зорку, віншуюць, спяваюць і весяляцца. Асаблівая радасць, калі да калядоўшчыкаў далучаюцца дзеці і ўнукі.**

**— Гэты буклей я захоўваю вельмі даўно, — кажа 58-гадовы паляшук Іван Ільючык. — Рамантую, выразаю з газет «кветусы» — так кажуць у Багданаўцы пра імітацыю махроў. Хочацца паказваць нашу традыцыйную рэліквію, ладзіць свята для сябе і для іншых!**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

● **БРСМ рыхтуе стратэгію развіцця маладзёжнай арганізацыі на наступныя пяць гадоў.**

● Пастаўскі малочны завод завяршыў рэалізацыю інвестпраекта па мадэрнізацыі цэха нарэзкі сыроў.

● **Нацыянальны мастацкі музей прымеркаваў да свайго 80-годдзя выпуск абноўленай карты госця.**

● Зімовы чэмпіянат па фотабёрдынгу ўпершыню пройдзе ў Беларусі 26 студзеня.



ISSN 1990 - 763X

Спажывец

# ЛАСУНКІ РУЧНОЙ РАБОТЫ

### Хто гандлюе дамашняй выпечкай на рынку

**Паўгода таму дамашнім кухарам і кандытарам дазволілі прадаваць сваю прадукцыю на рынках. Каб атрымаць месца за прылаўкам, дастаткова толькі зрабіць флюарграфію і заплаціць адзіны падатак. Здавалася б, спрошчаныя ўмовы павінны завабіць кулінараў да гандлёвых рады. Але, як аказалася, такая магчымасць пакуль не карыстаецца папулярнасцю.**

Новыя правілы дзейнічаюць з чэрвеня мінулага года. Згодна з пастановай Саўміна № 452, асобы, якія вырабляюць кандытарскія і хлебабулачныя вырабы без рэгістрацыі ІП, могуць гандляваць імі на рынку. Прычым без праходжання санітарна-ветэрынарнай экспертызы і дакументаў, якія пацвярджаюць якасць і бяспеку выпечкі. У сталіцы прадаваць ласункі кулінары могуць і на сельскагаспадарчых кірмашах на гарадскіх пляцоўках.

На Чыжоўскім рынку ў Мінску прадаўцоў з дамашнім печывам і цукеркамі не відаць. У адміністрацыі гандлёвага аб'екта расказваюць, што да іх за ўвесь час паступіў толькі адзін зварот па гэтым пытанні.

— Але чалавек нават не выставіўляўся. Прыйшоў, паглядзеў месца, напэўна, і перадумаў. Рынак сам па сабе невялікі, руху пакупнікоў тут асабліва няма, — называюць у адміністрацыі магчымую прычыну непапулярнасці месцаў за прылаўкам у кандытараў.

На рынак у Ждановічах за паўгода ніхто з дамашніх хлебапёкаў таксама не прыйшоў. «У нас зона гандлю прадуктамі ёсць толькі на вуліцы — не самыя зручныя ўмовы, каб прадаваць выпечку», — тлумачаць там.

СТАР. 4

З нагоды

# Для аўтараў і чытачоў

### Кніжная выстаўка будзе прысвечана Году малой радзімы і ІІ Еўрапейскім гульням

**XXVI Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш пройдзе з 6 да 10 лютага ў выставачным комплексе «БелЭкспа», што на праспекце Пераможцаў, 14. Сёлета кніжны форум мяркуецца прысвяціць Году малой радзімы і ІІ Еўрапейскім гульням. Асаблівая ўвага будзе звернута і на юбілеі класікаў беларускай літаратуры, на памятныя гістарычныя даты нашай краіны.**

Упершыню выстаўка пройдзе не толькі на пляцоўках выставачнага комплексу, але і ў кнігарнях, бібліятэках і музеях. Запланаваны літаратурныя экскурсіі і паэтычныя маршруты. Адбудуцца тэматычныя семінары, на якіх плануецца абмеркаваць сусветныя тэндэнцыі ў афармленні кніг, краўдфандынг (збор грошай на пэўны культурны праект праз інтэрнэт), літаратурную крытыку і блогінг, работу ў сацыяльных сетках, у тым ліку па папулярызацыі новых выданняў.

Як заўсёды, падчас выставы пройдуць сустрэчы з аўтарамі, выдаўцамі, мастакамі. Не абыдзецца кірмаш і без прэзентацый кніг, круглых сталоў, аўтограф-сесій выдатных пісьменнікаў, некаторыя з іх правядуць майстар-класы. Будзе працаваць і асобная дзіцячая пляцоўка.

Экспазіцыя «Друкарскі двор XVI стагоддзя» прадэманструе ўнікальную абстаноўку старадаўняй друкарні. Там, ужо традыцыйна, ахвотныя змогуць уласнымі рукамі надрукаваць старонкі кніг па старадаўняй тэхналогіі. І нават зрабіць паперу з ільну!

Як заўсёды, адна з ключавых падзей выстаўкі — міжнародны сімпозіум літаратараў «Пісьменнік і час». 6 і 7 лютага ў ім прымуць удзел аўтары з краін блізкага і далёкага замежжа. Таксама цікавасць выкліча семінар маладых літаратараў і перакладчыкаў.

На цэнтральнай пляцоўцы пройдзе ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў 58-га нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі» і конкурсу маладых літаратараў «Першацвет». А ганаровым госцем кніжнага форуму сёлета стануць Злучаныя Штаты Амерыкі.

Нагадаем, што ў кніжнай выстаўцы бяруць удзел як выдаўцы, так і кнігагандляры, вытворцы паліграфічнай прадукцыі. Тут традыцыйна не толькі набываюцца актуальныя кнігі, але і сустракаюцца даўнія сябры і падпісваюцца новыя дамовы.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**